При работе с НКН необходимо избегать искажения аутентичных традиций, изменения смысла и ценности наследия для его носителей. Проведение обрядов календарного цикла в несоответствующий период, десакрализация пространств, упрощение ремесленных изделий, чрезмерная коммерциализация – это риски и угрозы, которые необходимо минимизировать при работе с материальным наследием [6, с. 59].

Сохранение и популяризация НКН является важнейшей составляющей стратегии развития туризма и обеспечения его устойчивого развития. Нематериальное наследие Витебщины при грамотной работе может стать туристическим ресурсом, который укрепит национальную идентичность, расширит туристический потенциал, создаст новые рабочие места и привлечёт инвестиции в местные бюджеты. Для достижения этих целей необходимо системное взаимодействие органов власти, туристического бизнеса и научных институтов. А так же использование современных технологий и международного опыта.


1. Клицунова, В. Интерпретация наследия в туризме. Новые подходы в эпоху экономики впечатлений / В. Клицунова. – Минск : Четыре четверти, 2021. – 219 с.
2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры 20 ліпеня 2016 г. № 413-З (в ред. Закона Республики Беларусь от 21.07.2022 № 201-З) // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [сайт]. – Минск, 2003–2025. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=Hk1600413 (дата обращения: 15.09.2025).
3. Рэзкіна, Л. П. Васільковая спадчына продкаў. Каталог элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Віцебскай вобласці / Л. П. Рэзкіна (уклад.). – Витебск: ГУ “Витебский областной методический центр народного творчества”, 2023.
4. Сохранение нематериального историко-культурного наследия Беларуси: Международный и национальный опыт / ГУ “Гомельский областной центр народного творчества”. – Гомель, 2024.
5. Сташкевіч, А. Жывая спадчына Беларусі / А. Сташкевіч – РУП “Информационно-вычислительный центр Министерства финансов Республики Беларусь, 2017.
6. Филипчик, Д. В. Материалы по использованию нематериального культурного наследия для развития туризма в Республике Беларусь / Д. В.Филипчик. – Минск, 2022.



**Лембовіч Д.Ц.**


## РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ДЗЯРЖЫНСКАГА РЭГІЁНА: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ


*Ключавыя словы:* рэвіталізацыя, гісторыка-культурная спадчына, Дзяржынскі раён, захаванне помнікаў, турыстычны патэнцыял.


Актуальнасць тэмы артыкула абумоўлена неабходнасцю захавання і адаптацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ва ўмовах сучасных урбаністычных і сацыяльных трансфармацый. Рэвіталізацыя аб’ектаў гісторыі і культуры ўяўляе сабой не толькі іх рэстаўрацыю, але і інтэграцыю ў сучаснае жыццё, што дазваляе захаваць сацыякультурную ідэнтычнасць насельніцтва асобных рэгіёнаў, заснаваную на багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыне. Аднаўленне помнікаў і прыстасаванне старых пабудоў пад сучасныя патрэбы грамадства садзейнічае развіццю турызму, што ўплывае на эканоміку рэгіёна, а прыцягненне ўвагі да гісторыі і культуры – павышэнню ўзроўня адукацыі і патрыятызму сярод жыхароў пэўнай мясцовасці.

Дзяржынскі раён, размешчаны ў цэнтральнай частцы Мінскага рэгіёна, мае значны гісторыка-культурны патэнцыял. На яго тэрыторыі размешчаны 13 аб’ектаў уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: помнікі гісторыі (магіла святой блажэнай Валянціны Мінскай (1966 г.), магіла Марата Казея (1944 г.), брацкія могілкі), помнікі археалогіі (гарадзішча, курганныя могільнікі), помнікі архітэктуры (“Фрагменты сядзібна-паркавага комплексу “Капыліншчына”, “Комплекс былой сядзібы XIX ст.”, “Ансамбль былой сядзібы XIX ст.”). Сярод найбольш каштоўных можна вызначыць комплекс былой сядзібы XIX ст. у аг. Волма (2 катэгорыя) і ансамбль былой сядзібы XIX ст. ў в. Станькава (3 катэгорыя).

Рэвіталізацыя гісторыка-культурнай спадчыны ў Дзяржынскім раёне ўключае ў сябе некалькі асноўных напрамкаў. Перш за ўсё, гэта рэстаўрацыя і рэканструкцыя помнікаў архітэктуры, якія валодаюць гістарычнай каштоўнасцю, з мэтаю вяртання іх першапачатковага выгляду і, адначасова, прыстасавання для сучаснага выкарыстання. Па-другое, актыўнае стварэнне новых музейных прастор і экспазіцый, якія распавядаюць пра гісторыю рэгіёна, вядомых жыхароў і важныя дасягненні. Па-трэцяе, развіццё турыстычнай інфраструктуры, стварэнне камфортных умоў для гасцей раёна з дапамогай уладкавання пешаходных зон, усталявання інфармацыйных стэндаў, распрацоўкі новых турыстычных маршрутаў, што спрыяе папулярызацыі Дзяржынскага рэгіёна.

Сярод прыкладаў паспяховай рэвіталізацыі з дапамогай дзяржаўных інвестыцый можна адзначыць аднаўленне сядзібы Ваньковічаў у аг. Волма, якая, згодна крыніцам, вядома з XV ст., як уладанне віленскага старасты Манівіда. З цягам часу сядзіба перайшла ў гаспадаранне Альбрэхта Гаштольда, потым – Радзівілаў, у XVII ст. стала вотчынай Валадковічаў, пазней – Філіповічаў, а ў пачатку XIX ст. – Ваньковічаў. Новая сядзіба фарміравалася апошнімі на беразе р. Волма ў стылі класіцызму. У яе склад уваходзілі: сядзібны дом, флігель-кухня, дом з мансардай, службовы корпус, капліца-пахавальня, шэраг гаспадарчых пабудоў, невялікі парк [1, с. 115].

Сядзібны дом размешчаны ў цэнтральнай частке сядзібы, двухпавярховы, простакутны ў плане, меў калідорную планіроўку. Сярод цікавых канструктыўных вырашэнняў – сцены, якія мелі таўшчыню каля аднаго метра. Знешняе аздабленне будынка даволі сціплае, прамавугольныя ваконныя праёмы з руставанымі перамычкамі і сандрыкамі. Калісьці цэнтральны фасад сядзібнага дома быў вылучаны чатырохкалонным порцікам, але ён не захваўся. У падмурках будынка размяшчаліся скляпенчатыя сутарэнні, якія выкарыстоўваліся для захавання ежы. Апошні ўладальнік сядзібы Леон Ваньковіч пабудаваў пабач з сядзібным домам аднапавярховы дом з мансардай і жыў у ім апошнія гады, а двухпавярховы будынак быў прыстасаваны пад маслазавод. Па гэтай прычыне ў паўднёвым фасадзе з’явіліся дадатковыя дзверы. Побач з сядзібным домам размешчана кухня-флігель, на супрацьлеглым беразе ракі – капліца-пахавальня.

Да нашых часоў будынкі сядзібы захаваліся. Зараз у ей размяшчаецца філіял установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі” Эка-Тэхна-Парк “Волма”. Побач з сядзібай былі пабудаваны новыя карпусы, у якіх размясціліся навуковыя лабараторыі і іншыя тэхнічныя кабінеты, а на будынках былой сядзібы пачаліся рэмонтна-рэстаўрацыйныя работы, якія фінансаваліся па Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме.

У 2020 г. былі завершаны работы па аднаўленню флігеля-кухні. Згодна праекту, у будынку размешчана зала для правядзення святаў, побач абсталявана кухня, для прыгатавання святочных страў. У сваю чаргу, у 2022 г. скончаны работы па рэстаўрацыі двухпавярховага сядзібнага дома. На першым паверсе будынка размясцілася канферэнц-зала для правязення сходаў і дзелавых сустрэч, невялікая малельня. Другі паверх цалкам адведзены пад гасцініцу, разлічаную на 50 месцаў [2]. На астатніх будынках, якія ўваходзяць у склад сязібы, працягваюцца рэстаўрацыйныя работы.

Наступным прыкладам рэвіталізацыі з’яўляецца сядзіба ў в. Станькава, якая вядома з XIV ст. і належыла Дарагастайскім, пазней – Радзівілам. Апошнімі ўладальнікамі маёнтка сталі Гутэн-Чапскія, якія збудавалі тут сваю радавую рэзідэнцыю. У склад сядзібы ўваходзілі: палац, кухонны флігель, павільён “Скарбніца”, Свята-Мікалаеўская царква, дом для прыслугі, свіран, кароўнік і чатыры ўяздныя брамы. Да нашых часоў дайшлі амаль усе пабудовы былой сядзібы, акрамя будынка палаца [5, с. 218].

Дамінантай ансамбля з’яўляецца Свята-Мікалаеўская царква, пабудаваная ў 1858 г. па праекту знакамітага архітэктара Канстанціна Тона ў руска-візантыйскім стылі на сродкі Эмерыка Гутэн-Чапскага. Гэта крыжова-купальны храм з убудаванай у асноўны аб’ём званіцай над бабінцам і вялікай паўкруглай апсідай. Тры арачныя

ўваходы афармлены манументальнымі парталамі, арачныя вокны аздоблены ліштвамі. У архітэктуры выкарыстаны какошнікавы парапет, закамары, аркатуры [3, с. 88].

У 1930-я гг. царква была зачынена і выкарыстоўвалася ў якасці збожжасховішча. З дапамогай ваеннай тэхнікі вясной 1961 г. храм разбурылі, а цэглу будынка выкарысталі для збудавання новай плацiны. Больш за 40 год толькі рэшткі святыні нагадвалі мясцовым жыхарам аб мінулым. У 2007 г. на сродкі грамадскасці пачаліся рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Праект, аўтарам якога стаў мясцовы жыхар Алег Маслієў, выкананы па эскізных рашэннях і комплексных навуковых пошуках, зацверджаных Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у 2007 г. На сёняшні дзень гістарычны воблік храма поўнасцю адноўлены і ў ім праводзяцца набажэнствы.

Будынак павільёна "Скарбніца" закладзены ў XVIII ст., а стыль нэаготыкі набыў пасля перабудовы ў сярэдзіне XIX ст. Унутры будынка размяшчаліся дзве аднолькавыя па памеры залы і былі прызначаны для графскай бібліятэкі, якая налічала каля 20 тысяч тамоў кніг. На другі паверх вяла спіральная лесвіца, якая была ўсталявана ў адной з веж [4, с. 286].

У 1972 г. у будынку размясціўся музей Героя Савецкага Саюза Марата Іванавіча Казея, што дзейнічаў да 1994 г., пасля чаго павільён не выкарыстоўваўся пад грамадскія патрэбы. На аснове праведзеных даследаванняў выяўлена, што павільён мае шматлікія фасадныя і канструктыўныя дэканструкцыі як вынік безгаспадарнага існавання, і патрабуе рэстаўрацыі. У 2023 г. мясцовымі ўладамі быў знойдзены прыватны інвестар, які згадзіўся ўкласці грошы ў аднаўленне "Скарбніцы" і стварэння ў будынку нумізматычнага музея. Нельга не пагадзіцца, што гэта добрая магчымасць надаць новае жыццё гістарычнай прасторы, якая будзе прываблiваць шырокае кола наведвальнікаў.

Такім чынам, рэвіталізацыя гісторыка-культурнай спадчыны мае важнае значэнне для ўстойлівага развіцця Дзяржынскага рэгіёна, з'яўляецца магутным інструментам для павышэння якасці жыцця, умацавання эканамічнага дабрабыту і фарміравання ўстойлівай будучыні для рэгіёна, заснаванай на павазе да мінулага і імкненні да інавацый. Гэты працэс не проста аднаўляе аблічча старадаўніх будынкаў і помнікаў, а натхняе новае жыццё ў гістарычныя прасторы, робіць іх актуальнымі і запатрабаванымі ў сучасным свеце. Разам з тым, рэстаўрацыя помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны – складаны працэс, які патрабуе істотных фінансавых укладанняў.

Аналіз вопыту Дзяржынскага рэгіёна дэманструе што акрамя дзяржаўнай падтрымкі, для аднаўлення гістарычных аб'ектаў, мэтазгодна выкарыстоўваць пазабюджэтныя крыніцы – прыватныя інвестыцыі і краудфандынгавыя ініцыятывы, заснаваныя на падтрымцы грамадскасці. Напрыклад, рэалізацыя праекта рэканструкцыі сядзібы у аг. Волма наглядна дэманструе паспяховую практыку адаптацыі гістарычнага аб'екта для патрэб адукацыі і адпачынку. У выніку праведзеных работ, фінансуемых у рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, сядзіба не толькі захавала сваю гістарычную каштоўнасць, але і атрымала новае функцыянальнае прызначэнне. У сваю чаргу, аднаўленне Свята-Мікалаеўскай царквы, ініцыяванае і прафінансаванае грамадскасцю, з'яўляецца яркім прыкладам эфектыўнага ўдзелу насельніцтва ў захаванні культурнай спадчыны, спрыяла адраджэнню духоўнага жыцця ў рэгіёне. У той жа час, прыцягненне прыватнага інвестара для рэстаўрацыі павільёна "Скарбніца" і стварэння там нумізматычнага музея стварае спрыяльнае асяроддзе для развіцця турызму, бізнэсу і крэатыўных індустрый.

1. Валаханович, А. И. Дзержинщина: прошлое и настоящее / А. И. Валаханович, А.Н. Кулагин. – Минск : Наука и техника, 1986. – 197, [2] с.

2. Гісторыка-культурны патэнцыял // Экатэхнапарк Волма. – URL: https://etp-volma.by/istoriko-kulturnyij-potenczial (дата звароту: 01.04.2025).

3. Маслиев, О. И. Архитектурные памятники Станьково – реставрация и восстановление / О. И. Маслиев // Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння Эмерыка фон Гутэн-Чапскага, Мінск, 16–18 сакавіка, 2009. – Мінск, 2009. – С. 88–123.

4. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Минск : Полифакт, 2000. – 416 с.

5. Якімовіч, Ю. Кайданаўскія сядзібы / Ю. Якімовіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мінск : БелСЭ, 1986. – Т. 3. – 463 с.